ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 33 (233) | Субота, 20 лістапада 1976 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## З ВЫСОКАЙ УЗНАГАРОДАЙ!

**За дасягнутыя поспехі на XXI Алімпійскіх гульнях, VI летняй Спартакіядзе народаў СССР і высокія паказчыкі ў развіцці фізкультурна-масавай і спартыўнай работы ў дзевятай пяцігодцы, вялікая група спартсменаў, іх трэнераў, работнікаў фізічнай культуры, партыйных і савецкіх работнікаў Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР ад 12 лістапада 1976 года ўзнагароджана Ганаровай граматай і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.**

**Ганаровай граматай узнагароджаны студэнт факультэта фізічнага выхавання нашага ўніверсітэта, чэмпіён VI летняй Спартакіяды народаў СССР па веславанні на байдарках ВЕРАБ'ЁЎ Віктар Яфімавіч, а таксама яго трэнер ГАЎРЫЛЕНКА Мікалай Васільевіч з Рагачова, які завочна закончыў ГДУ.**

**Грамат Вярхоўнага Савета БССР удастоены студэнтка факультэта фізвыхавання, сярэбраны прызёр VI летняй Спартакіяды СССР па веславанні на байдарках ТРАХІМЕНАК Надзежда Пятроўна і выпускніца эканамічнага факультэта, удзельніца XXI Алімпійскіх гульняў МАРЫНЕНКА Надзежда Барысаўна, якая працуе цяпер трэнерам па лёгкай атлетыцы Гомельскага райсавета ДСТ «Лакаматыў».**

# ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

## АБ ПЛЕНУМЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ БЕЛАРУСІ

**У Мінску 17 лістапада адбыўся чарговы, IV пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі.**

**Пленум ЦК КПБ разгледзеў пытанні:**

**1. Аб задачах партыйных арганізацый рэспублікі ў сувязі з рашэннямі кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС і прамовай на Пленуме Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева.**

**2. Аб Дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1976—1980 гады і аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1977 год.**

**3. Аб унясенні ў мерапрыемствы Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС дапаўненняў і ўдакладненняў, якія зыходзяць з вынікаў кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС і ў сувязі з прыняццем Дзяржаўнага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады і Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1977 год.**

**З дакладам «Аб задачах партыйных арганізацый рэспублікі ў сувязі з рашэннямі кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС і прамовай на Пленуме Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева» выступіў кандыдат у члены Палітбюро ЦК КПСС, першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі П. М. МАШЭРАЎ.**

**Па пытанню «Аб Дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1976—1980 гады і аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1977 год» з дакладам выступіў Старшыня Савета Міністраў БССР Ц. Я. КІСЯЛЁЎ.**

**З паведамленнем аб унясенні ў мерапрыемствы Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС дапаўненняў і ўдакладненняў, якія зыходзяць з вынікаў кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС і ў сувязі з прыняццем Дзяржаўнага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1976—1980 гады і Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1977 год выступіў другі сакратар ЦК КП Беларусі А. Н. АКСЁНАЎ.**

**Па абмеркаваных пытаннях пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі прыняў адпаведную пастанову.**

**Пленум ЦК Кампартыі Беларусі цалкам і поўнасцю адобрыў і прыняў да няўхільнага выканання рашэнні кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС, палажэнні і вывады, змешчаныя ў прамове на Пленуме Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева.**

**Пленум ЦК КПБ адобрыў у асноўным праекты Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1976—1980 гады, Дзяржаўнага плана развіцця народнай гаспадаркі БССР на 1977 год і вырашыў унесці іх на разгляд сесіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.**

# СЕСІЯ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

У абстаноўцы вялікага працоўнага і палітычнага ўздыму савецкіх людзей, выкліканага рашэннямі кастрычніцкага (1976 г.) Пленума ЦК КПСС, прамовай на Пленуме Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева, 18 лістапада ў Мінску пачала работу чацвёртая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР дзевятага склікання.

На разгляд Вярхоўнага Савета Беларускай ССР уносяцца наступныя пытанні:

1. Аб Дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1976—1980 гады.

2. Аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1977 год.

3. Аб Дзяржаўным бюджэце Беларускай ССР на 1977 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР за 1975 год.

Гэтыя пытанні ўносяцца Саветам Міністраў Беларускай ССР.

4. Аб зацвярджэнні Указаў Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

5. Аб утварэнні пастаяннай камісіі па пытаннях працы і быту жанчын, аховы мацярынства і дзяцінства Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Пытанні ўносяцца Прэзідыумам Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Слова для даклада аб Дзяржаўным пяцігадовым плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1976—1980 гады і аб Дзяржаўным плане развіцця народнай гаспадаркі Беларускай ССР на 1977 год атрымлівае Старшыня Савета Міністраў БССР дэпутат Ц. Я. Кісялёў.

З дакладам аб Дзяржаўным бюджэце Беларускай ССР на 1977 год і аб выкананні Дзяржаўнага бюджэту Беларускай ССР за 1975 год выступіў міністр фінансаў Беларускай ССР дэпутат Б. І. Шаціла.

Учора, 19 лістапада, чацвёртая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай ССР дзевятага склікання працягвае сваю работу.

(БЕЛТА).

ЛЕНІНСКІ ЎРОК

## У ПРЫСУТНАСЦІ ДЭЛЕГАТА XXV З'ЕЗДА КПСС

У акадэмічных групах гісторыка-філалагічнага факультэта, як і ва ўсім універсітэце, гэтымі днямі праходзіць Ленінскі ўрок «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!». Асабліва цікавым ён атрымаўся ў групах Г-31 і Г-32. Студэнты запрасілі на ўрок дэлегата XXV з'езда КПСС, перадавую работніцу фабрыкі «8-га Сакавіка» Марыю Аляксандраўну Плескую, якая з'яўляецца адной з ініцыятараў спаборніцтва за датэрміновае выкананне заданняў дзесятай пяцігодкі.

На ўроку са змястоўнымі дакладамі, прысвечанымі матэрыялам кастрычніцкага Пленума ЦК КПСС (1976 г.), выступілі камсамольцы Ларыса Касьянава, Андрэй Лук'яновіч, Галіна Матусевіч, Валянціна Гаравая.

З захапленнем слухалі студэнты выступленне М. А. Плескай. Марыя Аляксандраўна расказала пра работу XXV з'езда КПСС, аб цікавых сустрэчах у Крамлёўскім Палацы з'ездаў і сталіцы нашай Радзімы — Маскве, пра ўласны жыццёвы і працоўны шлях, пра свой патрыятычны пачын па датэрміноваму выкананню заданняў юбілейнай, дзесятай пяцігодкі, адказала на шматлікія пытанні.

Ва ўдзячнасць аб памятнай сустрэчы студэнты ўручылі М. А. Плескай кветкі.

**В. ВЗДОРАВА,**
**камсорг 3-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**На здымку: на Ленінскім уроку выступае дэлегат XXV з'езда КПСС М. А. Плеская.**

Фота **А. Шчыгрова.**





ВУЧОНЫЯ —ВЫТВОРЧАСЦІ

## АБ ЭФЕКТЫЎНЫМ ВЫКАРЫСТАННІ НОВАЙ ТЭХНІКІ

На мінулым тыдні ў пятніцу Гомельскі гарком КПБ, камітэт па эканоміцы і арганізацыі вытворчасці Гомельскага абласнога савета НТТ, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт і Гомельскі аддзел Беларускага навукова-даследчага інстытута навукова-тэхнічнай інфармацыі правялі навукова-практычную канферэнцыю «Павышэнне эфектыўнасці выкарыстання новай тэхнікі ў вытворчасці».

На канферэнцыі было заслухана і абмеркавана шэсць дакладаў. Два з іх былі зроблены вучонымі эканамічнага факультэта ГДУ: кандыдатам эканамічных навук Я. Я. Вяршыгарой на тэму: «Удасканальванне планавання тэхнічнага прагрэсу на прадпрыемствах машынабудавання Гомельскай вобласці» і загадчыкам кафедры галіновых эканомік, прафесарам С. А. Кімам на тэму: «Эканамічная эфектыўнасць паляпшэння выкарыстання новай тэхнікі на вытворчасці».

## НА АСНОВЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА

Паміж эканамічным факультэтам ГДУ і заводам «Гомсельмаш» заключаны дагавор на сацыялістычнае супрацоўніцтва. Вучоныя ўніверсітэта сталі цяпер пастаяннымі наведвальнікамі калектыву машынабудаўнікоў. Тут перыядычна праводзіцца «Дзень навукі». Адбыўся ён і ў мінулы аўторак. Перад работнікамі завадакіраўніцтва з лекцыяй «Удасканальванне сістэмы кіравання» выступіў загадчык кафедры галіновых эканомік, прафесар С. А. Кім. «Планаванне — цэнтральнае звяно сістэмы кіравання» — тэма лекцыі кандыдата эканамічных навук Я. Я. Вяршыгары, якую з вялікай цікавасцю выслухалі рабочыя трэцяга механічнага цэха.

З актуальнымі лекцыямі выступілі кандыдаты эканамічных навук: І. К. Кекіш — у першым механічным цэху, А. В. Нявераў — у аддзеле тэхнічнага кантролю, Т. Д. Трацэўская — у тэрмічным і парасілавым цэхах, кандыдат гістарычных навук Т. П. Трацэўская — у ліцейным цэху шэрага чыгуна, выкладчык П. А. Дуброўскі — у механазборачным цэху, аспірант У. Я. Пашук — у ліцейным цэху цвёрдага чыгуна.

Цяпер, калі гомсельмашаўцы праводзяць рэканструкцыю завода і рыхтуюцца да выпуску самаходнага кормаўборачнага камбайна, вучоныя-эканамісты ўніверсітэта заклапочаны аб тым, каб аказаць машынабудаўнікам як мага большую дапамогу ў паспяховым выкананні пастаўленага перад імі партыяй і ўрадам адказнага задання.

*На IV справаздачна-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі супрацоўнікаў універсітэта*

# ЗАЙМАЦЬ АВАНГАРДНУЮ РОЛЮ

Як мы паведамлялі, у актавай зале ўніверсітэта адбылася IV справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя прафесарска-выкладчыцкага, вучэбна-дапаможнага і адміністрацыйна-гаспадарчага персаналу ГДУ.

Са справаздачай аб дзейнасці мясцовага камітэта выступіла старшыня мясцкома **А. В. Саннікава.**

У дакладзе была падрабязна прааналізавана работа ўсіх пастаянных камісій мясцовага камітэта, дадзена ацэнка калектыву ўніверсітэта па далейшаму павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

За справаздачны перыяд, адзначалася ў дакладзе, мясцком універсітэта многае зрабіў па ўдасканальванню вучэбна-метадычнай, навукова-даследчай работы, выхаванню камуністычных адносін да працы, паспяховаму выкананню сацыялістычных абавязацельстваў. У сваёй дзейнасці мясцовы камітэт абапіраўся на шырокі прафсаюзны актыў універсітэта.

Прафсаюзная арганізацыя не знаходзілася ў баку ад той работы, якая праводзілася рэктаратам, парткомам, дэканатамі і кафедрамі па падбору, рацыянальнай растаноўцы, выхаванню і павышэнню кваліфікацыі педагагічных кадраў. Выбранне і перавыбранне па конкурсу прафесарска-выкладчыцкага саставу праходзіла ў абстаноўцы высокай патрабавальнасці. Прафсаюзныя арганізацыі кафедр і факультэтаў правільна падыйшлі да ацэнкі работы сваіх таварышаў, рэкамендуючы іх на займаемую пасаду.

За справаздачны перыяд мясцовым камітэтам паспяхова праведзена работа па арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва паміж факультэтамі і кафедрамі. Вынікі грамадскіх аглядаў паказалі, што найлепшым чынам арганізавана сацспаборніцтва на эканамічным і фізічным факультэтах. Кафедры гэтых факультэтаў дабіваюцца актыўнага ўздзеяння на павышэнне эфектыўнасці працы выкладчыкаў, лабарантаў, аспірантаў і студэнтаў. Выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі кафедр прынялі канкрэтныя індывідуальныя абавязацельствы, ход выканання якіх абмяркоўваецца на сходах прафгруп. Па выніках 1975 года пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва стаў фізічны факультэт. Яму прысуджаны пераходны Чырвоны Сцяг, вымпел, Ганаровая грамата рэктарата, парткома і мясцкома.

Шмат увагі мясцком удзяляў далейшаму паляпшэнню культурна-масавай і спартыўна-аздараўленчай работы.

Ва ўніверсітэце распрацаваны і паспяхова рэалізуюцца канкрэтныя мерапрыемствы па вывучэнню і прапагандзе матэрыялаў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ. Сумесна з усімі грамадскімі арганізацыямі ГДУ мясцовы камітэт правёў урачыстыя вечары, прысвечаныя традыцыйным савецкім святам. Сістэматычна арганізоўваліся творчыя сустрэчы супрацоўнікаў універсітэта з артыстамі тэатра, кіно, эстрады. Традыцыйнай стала круглагадовая спартакіяда «Здароўе» сярод супрацоўнікаў ГДУ па шахматах, шашках, валейболу, стральбе, мнагабор'ю ГПА.

А. В. Саннікава ўскрыла таксама недахопы і пралікі, якія мелі месца ў рабоце мясцовага камітэта. Яна адзначыла, што недастаткова ўдзялялася ўвагі вытворчым пытанням, умацаванню працоўнай дысцыпліны супрацоўнікаў універсітэта, паляпшэнню ўмоў быту маладых спецыялістаў.

У спрэчках па дакладу інжынер па тэхніцы бяспекі і ахове працы **І. Ф. Сяцяеў** гаварыў аб вялікай рабоце, праведзенай камісіяй па тэхніцы бяспекі і ахове працы за справаздачны перыяд. На аб'ектах універсітэта, на многіх кафедрах і іншых участках зроблены рамонт вучэбна-лабараторнага, тэхналагічнага і вытворчага абсталявання. У выкананні гэтых мерапрыемстваў праявілі настойлівасць кіраўніцтва і работнікі адміністрацыйна-гаспадарчай часткі. З кожным годам усё больш выкладчыкаў, лабарантаў прымаюць удзел у паляпшэнні ўмоў працы і вучобы ў лабараторыях, майстэрнях.

Старшыня прафкома ўніверсітэта **Н. Колтышава** звярнула ўвагу на пытанне лепшай арганізацыі культурнага адпачынку студэнтаў. Трэба шукаць новыя формы і напрамкі ў дзейнасці культмасавых сектараў, гаварылася ў яе выступленні. Мерапрыемстваў, якія праводзяцца ў нас, яшчэ недастаткова. Актавая зала ГДУ ўмяшчае 700 чалавек, а ва ўніверсітэце займаецца больш 4 тысяч студэнтаў і працуе больш 500 выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Неабходна актывізаваць культурна-масавую работу на факультэтах, праводзіць сумесныя вечары адпачынку некалькіх факультэтаў.

**М. В. Гусева** расказала аб дзейнасці ўзначальваемага ею прафсаюзнага бюро гісторыка-філалагічнага факультэта, якое сістэматычна абмяркоўвала на сваіх пасяджэннях пытанні стану працоўнай і вучэбнай дысцыпліны, студэнцкай навуковай работы, выхаваўчых і спартыўна-масавых мерапрыемстваў.

Начальнік НДС **М. І. Твардоўскі** ў сваім выступленні асноўную ўвагу звярнуў на паляпшэнне арганізацыі навукова-даследчай работы ва ўніверсітэце, адзначыў, што цяпер на больш высокім узроўні вядзецца кіраўніцтва ходам выканання НДР, створаны навуковыя лабараторыі на грамадскіх пачатках, рэгулярна праводзяцца навуковыя семінары, тэматыка работ скаардынавана з вядучымі навуковымі ўстановамі АН БССР. Аднак неабходна шырэй прапагандаваць навукова-тэхнічныя дасягненні, своечасова падаваць заяўкі для ўдзелу ГДУ ў экспазіцыях ВДНГ СССР, прысвечаных 60-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Мэтазгодна стварыць на кожным факультэце грамадскія групы пад кіраўніцтвам прафбюро для падрыхтоўкі неабходных экспанатаў для выставак, каб прадставіць усе дасягненні нашага ўніверсітэта.

Аб істотных недахопах у рабоце культурна-масавай камісіі мясцкома гаварыла яе старшыня **І. В. Хадалевіч.** Яна адзначыла, у прыватнасці, што не існавала належных кантактаў мясцовага камітэта з камсамольскімі арганізацыямі ўніверсітэта, (студэнтаў і супрацоўнікаў). Яны мала займаліся культмасавай работай, якая з'яўляецца адным з асноўных звенняў ідэйнага выхавання моладзі.

У спрэчках выступілі таксама выкладчык кафедры англійскай мовы **Л. С. Кавалеўская**, загадчыца студэнцкай сталовай **Ф. К. Філон,** прафесар кафедры оптыкі фізічнага факультэта **В. П. Рвачоў.**

Па справаздачнаму дакладу была прынята адпаведная пастанова.

Канферэнцыя прызнала работу мясцовага камітэта здавальняючай. Выбраны новы састаў мясцкома і рэвізійнай камісіі, дэлегаты на абласную канферэнцыю.

## НОВЫ САСТАЎ МЯСЦКОМА

**Саннікава Анна Васільеўна** — старшыня мясцкома.

**Епіхава Маргарыта Уладзіміраўна** — сакратар мясцкома.

**Дзяменцьева Ляля Аляксандраўна** — казначэй мясцкома.

### ВЫТВОРЧАЯ КАМІСІЯ:

**Акуліч Мікалай Уладзіміравіч** — старшы выкладчык кафедры механікі.

**Твардоўскі Міхаіл Іванавіч** — начальнік НДС.

**Бабына Уладзімір Піліпавіч** — старшы выкладчык эканамічнага факультэта.

**Грынчык Мікалай Міхайлавіч** — загадчык кафедры беларускай літаратуры.

**Окрут Анатоль Іванавіч** — выкладчык кафедры палітэканоміі.

### ЖЫЛЛЁВА-БЫТАВАЯ КАМІСІЯ

**Башкірцава Эльга Сямёнаўна** — загадчыца кафедры нямецкай і французскай моў.

**Епіхава Маргарыта Уладзіміраўна** — лабарант кафедры галіновых эканомік.

**Гурэвіч Нэлі Абрамаўна** — бібліятэкар.

**Роўба Яўген Аляксеевіч** — старшы выкладчык кафедры матэматычнага аналізу.

### КУЛЬТУРНА І СПАРТЫЎНА-МАСАВАЯ КАМІСІЯ:

**Хадалевіч Ірына Васільеўна** — выкладчык кафедры фізіялогіі спорту і спартыўнай медыцыны.

**Перхунова Нэлі Іванаўна** — асістэнт кафедры хіміі.

**Каляда Віктар Антонавіч** — старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання.

**Шынкароў Аляксандр Андрэевіч** — загадчык лабараторыямі кафедры агульнай геалогіі.

### КАМІСІЯ ПА ТЭХНІЦЫ БЯСПЕКІ І АХОВЕ ПРАЦЫ:

**Шафарэнка Віталь Мікалаевіч** — выкладчык кафедры агульнай фізікі.

**Сувіжэнкаў Аляксандр Ціханавіч** — галоўны энергетык ГДУ.

### КАМІСІЯ САЦЫЯЛЬНАГА СТРАХАВАННЯ

**Саннікава Анна Васільеўна** — дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі.

**Епіхава Маргарыта Уладзіміраўна** — лабарант кафедры галіновых эканомік.

**Дзяменцьева Ляля Аляксандраўна** — інспектар аддзела кадраў.



Каб стаць добрымі спецыялістамі, студэнтам фізічнага факультэта даводзіцца выконваць шмат лабараторных работ. Іх выкананне па-сапраўднаму захапляе будучых спецыялістаў.

**НА ЗДЫМКУ:** чацвёртакурсніцы Н. Сырнікава і Н. Афанаськова на практычных занятках у лабараторыі рэнтгенаструктурнага аналізу.

Фота А. Шчыгрова.

## КАНФЕРЭНЦЫЯ ВУЧОНЫХ-ЗАОЛАГАЎ

Нядаўна ў Мінску праходзіла IV заалагічная канферэнцыя Беларускай ССР, на якой было прадстаўлена звыш 200 дакладаў па такіх раздзелах заалогіі, як біялагічныя асновы асваення, рэканструкцыі і аховы жывёльнага свету, змены фаўны пад уплывам меліярацыі і іншых антрапагенных фактараў, экалогія і сістэматыка жывёл, паразіта і паразітарныя захворванні.

Дакладам аб асноўных напрамках нацыянальнай экалагічнай праграмы ў СССР канферэнцыю адкрыў член-карэспандэнт АН БССР загадчык аддзела заалогіі і паразіталогіі Л. М. Сушчэня.

Вялікую цікавасць ва ўдзельнікаў канферэнцыі выклікаў прачытаны на пленарным пасяджэнні даклад супрацоўнікаў аддзела заалогіі і паразіталогіі АН БССР І. Т. Арзамасава, М. С. Долбіка і Э. І. Хацько «Змены наземнай фаўны Беларускага Палесся пад уздзеяннем меліярацыі зямель».

На канферэнцыі працавалі 4 секцыі: водных жывёл з падсекцыямі «водныя беспазваночныя» і «рыбы», наземных пазваночных, фаўны і экалогіі насякомых, паразіталогіі. Прачытаныя даклады сведчаць аб росце кадраў, актуальнасці даследаванняў беларускіх заолагаў, пашырэнні геаграфіі даследчых цэнтраў, фарміраванні інтэнсіўна і плённа працуючых калектываў заолагаў у абласных гарадах, у тым ліку ў Гомельскім універсітэце.

У рабоце канферэнцыі прымалі ўдзел супрацоўнікі кафедры заалогіі і дарвінізму нашага ўніверсітэта, якія прачыталі 5 дакладаў. Два з іх былі зроблены выкладчыкамі сумесна са студэнтамі. Даклад дацэнта І. П. Арабінай з'яўляецца вынікам работы выкладчыкаў і студэнтаў ГДУ і аддзела заалогіі і паразіталогіі АН БССР, якая вялася на аснове дагавораў аб доўгачасовым творчым супрацоўніцтве. З увагай і цікавасцю ўдзельнікі канферэнцыі выслухалі даклады старшага выкладчыка А. Д. Ціханскага і студэнткі І. Петрачэнка, аспіранта В. Верамеева, асістэнта В. П. Родзікава. Асабліва зацікавіла ўсіх членаў энтамалагічнай секцыі выступленне аспіранта В. Верамеева «Энергетычная характарыстыка глебавай мезафаўны асноўных тыпаў дуброў Прыпяцкага запаведніка». Свае даследаванні малады вучоны пачаў яшчэ студэнтам. Гэта дазваляе яму паспяхова займацца ў аспірантуры і, як паказала абмяркоўванне яго працы на канферэнцыі, дае аснову для важных у тэарэтычным і практычным плане вывадаў.

**Б. САВІЦКІ,**
**прафесар, загадчык кафедры заалогіі і дарвінізму.**

*Аб сацыялістычным ладзе жыцця*

## СЭНС ЖЫЦЦЯ

Векавыя пытанні чалавечага жыцця. Яны ўзнікаюць перад кожным з нас. І кожны чалавек павінен знайсці адказы на іх. Сярод гэтых векавых пытанняў пярвейшым з'яўляецца тое, якое закранае **сэнс жыцця.** У чым вышэйшыя каштоўнасці нашага быцця? Дзеля чаго варта жыць? Што варта адстайваць і зацвярджаць у жыцці?

У адказах на гэтыя пытанні можна чотка правесці мяжу буржуазнага і сацыялістычнага ладу жыцця, выдзеліць хібы ў ладзе жыцця асобных людзей.

Я гутару з двума студэнтамі эканамічнага факультэта. Віталь Драбышэўскі — ленінскі стыпендыят, Аляксандр Нілаў — кандыдат на выключэнне з універсітэта. Так сказаць, асобы — працілеглыя: лепшы і горшы ў студэнцкім калектыве факультэта.

Прашу Віталя пракаментыраваць наступныя радкі з паэмы Я. Еўтушэнкі:

Если цвесть —
так в полный колос,
Если взмыть —
так выше звёзд,
Если петь —
так в полный голос,
Если встать —
так в полный рост!

— Толькі так і варта жыць, — гаворыць Драбышэўскі. — Без пастаяннага імкнення да ўдасканальвання, без перадольвання ўсіх рубяжоў жыць нецікава.

— А як можна расцаніць жыццёвую позу (іменна позу, а не жыццё) Аляксандра Нілава?

— Лічу, што ён не жыве ў поўную меру сваіх магчымасцей, і гэтым самым наносіць шкоду не толькі грамадству, але і сабе.

Звяртаюся да Аляксандра.

— Як расцэньваеш сваю позу?

— Стаяць дык яно трэба ў поўны рост. Фізічна я так і раблю. А ў жыцці? Не ведаю, не думаў. Не аматар я выдзяляцца сярод натоўпу. Не лезу туды, куды мяне не просяць.

Я гавару Аляксандру аб тым, што любы чалавек варты

